ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

'91

ЧАЦВЕР
28
ЛЮТАГА
№ 5(1669)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ЧЫРВОНЫ РАДОК

Зацверджаны Савет па навукова-даследчай рабоце студэнтаў на чале са старшынёй прарэктарам БДУ па навуковай рабоце А. І. Лесніковічам. У задачы новага фарміравання ўваходзіць перш за ўсё неабходнасць перагледзець існуючую структуру навуковай дзейнасці студэнтаў, формы работы студэнцкіх навуковых гурткоў з улікам спецыфікі факультэтаў, а таксама забяспечыць больш якаснае правядзенне выніковай красавіцкай студэнцкай навуковай канферэнцыі ва універсітэце.

* * *

З 15 лютага ва універсітэце дзейнічае камітэт па падтрымцы грамадскага парадку ў месцах пражывання замежных грамадзян, які створаны з мэтай удасканалення работы па папярэджванню правапарушэнняў і злачынстваў у адносінах да замежных навучэнцаў, а таксама з іх боку. Узначаліў камітэт намеснік дэкана па рабоце з замежнымі студэнтамі асноўных факультэтаў М. А. Смірноў.

* * *

Васемнаццаці навучэнцам падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян паменшаны памер стыпендыі за люты. Іх правіннасць — спазненне пасля канікул да пачатку заняткаў, у аднаго з навучэнцаў — на 12 дзён.

* * *

24 лютага пачалася пяцімесячная навуковая камандзіроўка ў Японію вядучага навуковага супрацоўніка НДЛ біяэнергетыкі пры кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін біяфака У. А. Касцюка.

Больш працяглы тэрмін — 2 гады — адведзены на педагагічную работу ў Гвінеі дацэнта кафедры генетыкі і біятэхналогіі біяфака М. С. Марозіка, дацэнта кафедры тэорыі функцый мехмата Ф. В. Чумакова і дацэнта кафедры матэматычных метадаў тэорыі ўраўненняў таго ж факультэта І. А. Паўлава.

* * *

25 лютага Саветам БРК сумесна з памочнікам намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР Н. М. Мазай вырашылася пытанне аб прадстаўленні ў Вярхоўны Савет рэспублікі хадайніцтва аб увядзенні надбаўкі да зарплаты работнікаў вышэйшай школы памерам 50 працэнтаў ад новых ставак. Другім вынікам сустрэчы прадстаўнікоў БРК, абкома прафсаюзаў работнікаў народнай адукацыі, прафкомаў РТІ, Інстытута замежных моў і Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з Н. М. Мазай з'явілася стварэнне рабочай групы Міністэрства народнай адукацыі і БРК па выпрацоўцы новай канцэпцыі аплаты працы работнікаў вышэйшай школы.

ПІНГ-ПОНГ

Ці пагражае СНІД турмой?

Гавораць, што для хворых СНІДам у СССР адведзена спецыяльная турма-бальніца?

І. СУШЧЫК, студэнт.

— Безумоўна, не,— запэўнівае ўрач 2-й клінічнай бальніцы г. Мінска Таццяна Цімафееўна РАЧКО.— Да крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб мерах прафілактыкі заражэння вірусам СНІД» могуць быць прыцягнуты асобы, якія, ведаючы пра сваё жахлівае захворванне, садзейнічалі яго распаўсюджанню. Скажам, інфіцыраваны донар, які працягвае здаваць кроў, ці хворы, які ўступіў у палавы кантакт пасля таго, як урач папярэдзіў яго. «...Заражэнне другой асобы захворваннем СНІД асобай, якая ведала аб наяўнасці ў яе гэтай хваробы, караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да васьмі гадоў».

ДАРЭЧЫ, па афіцыйных паведамленнях САЗ, у свеце цяпер болей за 230 тысяч хворых СНІДам. За апошнія чатыры гады адбыўся рост захворвання ў 9 разоў. Мяркуецца, што інфіцыраваных ад 5 да 10 мільёнаў.

У СССР абследавана 30 мільёнаў чалавек. Выяўлена 500 савецкіх і 500 замежнікаў, якія заражаны вірусам. Рэальныя лічбы намнога вышэй — не менш за 10 тысяч.

Адзіны спосаб не памерці ад СНІДа — не заразіцца ім. Ці варта какетнічаць з вірусам, кожны вырашае для сябе сам. А верны шлях пазбавіцца ад снідафобіі — ПРАЙСЦІ АНАНІМНАЕ АБСЛЕДАВАННЕ Ў ПАКОІ № 216 33-Й СТУДЭНЦКАЙ ПАЛІКЛІНІКІ. ЧАС ПРЫЁМУ: З 8.00 ДА 19.00 (АКРАМЯ ВЫХАДНЫХ).

ПОГЛЯД

Не часта бывае ў сапраўднага студэнта аддушына. Калі можна забыць на нейкі час аб клопатах і справах, сесці і расслабіцца. Асабліва маюць патрэбу ў гэтым людзі дакладных навук — матэматыкі, напрыклад. Як важна хоць на хвіліну зняць з сябе напружанне, аддацца вольнаму цячэнню думак і прыемных успамінаў.

— Без гэтага нельга,— лічыць другакурсніца ФПМ Ірына КОСМІЧ.— Чалавеку проста неабходна папаўняць сваё сэрца зарадам цеплыні, пяшчоты і дабрыні.

Фота А. ГУСАКА.

«БЮРАКРАТЫЧНЫ» ВЕСНІК

Сітуацыя драматызуецца?

Прайшла зімовая сесія, якая яшчэ раз пацвердзіла, што паспяховасць студэнтаў мае устойлівую тэндэнцыю да зніжэння. Адно суцяшае ў сумнай канстатацыі: гэта бяда прыйшла не толькі ў наш універсітэт, яна характэрна для усёй сістэмы народнай адукацыі краіны. Сапраўдныя паражэнні ў нас яшчэ наперадзе, а пакуль крок да яе зрабілі 1606 студэнтаў, якія не здалі экзаменацыйную сесію на дзённай форме навучання. Гэта кожны шосты. Калі не ўлічваць «разбаўленасць» паказчыка выпускнымі курсамі, паспяховасць якіх ва ўсе часы была значна вышэй за астатнія, то колькасць «хвасцістаў» складзе болей за 18 працэнтаў. Параўнайце: у мінулым годзе 14,2 працэнта, у 1988 — 89 — 12,4, а ў далёкім 1985-86 — усяго 8,6 працэнта.

Не дасягнулі да мінулагодняй планкі выдатнікі — іх колькасць зменшылася на 14 студэнтаў.

Сярэднеуніверсітэцкі ўзровень паспяховасці — 83,3 працэнта.

Студэнты гуманітарных факультэтаў здалі сесію значна лепш за студэнтаў прыродазнаўчых. У нейкай ступені розніца гэта абумоўліваецца асаблівасцямі вучэбных планаў, бо летам яна ледзь адчувальная.

Абсалютная паспяховасць першакурснікаў склала 80,5 працэнта. Трэба адзначыць, што 80 з 838 медалістаў не здалі экзамены ў час першай сесіі, а яшчэ чатыры не з'явіліся на іх без уважлівых прычын.

Больш цвёрда трымаліся былыя пераможцы алімпіяд. Толькі двое з іх атрымалі нездавальняючыя адзнакі, двое не з'явіліся на экзамены без уважлівых прычын.

Лічбы сцвярджаюць: сітуацыя драматызуецца ад сесіі да сесіі. Як стабілізаваць абстаноўку?

Інтэрв'ю з прарэктарам **Пятром Дзмітрыевічам КУХАРЧЫКАМ**, якое будзе змешчана ў наступным нумары «Беларускага універсітэта»,— пошук выйсця.

ПА САКРЭТУ УНІВЕРСІТЭТУ

І густа, і пуста

Дырэктар фундаментальнай бібліятэкі універсітэта Ірына Уладзіміраўна АРЭХОЎСКАЯ выказала перад членамі вучонага савета свае асцярогі: захоўваць, а тым больш папаўняць двухмільённы кніжны фонд у хуткім часе будзе немагчыма, калі не «разгрузіць» і без таго малагабарытныя запаснікі. Састарэлыя кнігі — не зношаная адзежа, якая ператвараецца ў непатрэбную. Яны захоўваюць каштоўнасць як гісторыя прадмета. «Лішні» фонд можна перадаць ці прадаць іншай бібліятэцы. Зрабіць гэта, пэўна, лягчэй, чым змагацца з кніжнымі рабаўнікамі. Пасля іх вылазак знікаюць асобныя старонкі, главы, здараецца, цалкам вучэбныя тэмы і мастацкія творы. Нізкая культура тых, хто сядзіць побач, не дазваляе «абязброіць» злачынцаў. Адсутнасць капіравальнай тэхнікі толькі распаляе кніжны голад. Аднавіць жа фонд складана, бо часта каштуе цяпер неабходная выкладчыкам і студэнтам кніга 50—60 рублёў, што абумоўлівае немагчымасць заказваць літаратуру «на ўсялякі выпадак».

У бібліятэцы вядучай вышэйшай навучальнай установы адной з рэспублік самай чытаючай краіны катастрафічна не хапае падручнікаў. І калі дэканаты адвольна ставяцца да раскладу экзаменаў, не прадугледжваючы чарговасці сесій на стацыянары і ў завочнікаў — прыземленыя клопаты не могуць не адбіцца на паспяховасці студэнтаў, вызваленых міністэрскай рукой ад цяжару лекцыйных і практычных гадзін дзеля... самастойнай ра-

А Ў НАС! А Ў ВАС?

Свет выратуюць дапытлівыя

Колькі ж новага павінен быў адкрыць для сябе чалавек, перш чым стаць чалавекам! І што? Услед за палкай, якая дапамагла завалодаць яблыкам, ён вынайшаў звышадчувальныя прылады, а... далягляды ўсё шырэй. Ці глыбей? Чалавек прагнуў разгадаць таямніцы ўзаемаадносін у грамадстве...

Для студэнтаў першага курса аддзялення сацыялогіі філасофска-эканамічнага факультэта навука аб грамадстве — не толькі абраная спецыяльнасць, але, дзякуючы дацэнту кафедры сацыялогіі, кандыдату філасофскіх навук Івану Якаўлевічу Пісарэнку, і рэальная справа на сённяшні дзень.

Іх задача — стаць сапраўднымі сацыёлагамі. Адзін у полі — не воін. А аб'яднаўшыся ў студэнцкую лабараторыю? Трыццаць студэнтаў-сацыёлагаў, выкарыстоўваючы вучэбную базу кафедры сацыялогіі, здольныя прынесці універсітэту вялікую карысць і грашовую эканомію, а для сябе набыць тыя практычныя навыкі, якімі і на самай высокакласнай лекцыі не разжывешся.

— Нават тэарэтычныя веды,— сцвярджае першакурснік **Валерый ГРУШЭВІЧ**,— у галаве не затрымліваюцца, калі няма практычных пытанняў, на якія студэнт павінен шукаць адказы на лекцыях. Толькі тады інфармацыя знойдзе і трывала зойме сваё месца сярод назапашаных ведаў.

Пытанняў пасля першай спробы — апытання грамадскай думкі студэнтаў універсітэта і сапраўды паўстала шмат. І галоўнае — ці хутка набудзе творчы калектыў афіцыйны статус? А пакуль знаёмцеся...

ЛЮСТЭРКА

Раскоша не для нас

«Супрацоўнікі» студэнцкай сацыялагічнай лабараторыі пры кафедры сацыялогіі філасофска-эканамічнага факультэта заняліся высвятленнем пытання: раскашаваць ці эканоміць студэнту на ўласнай адукацыі? Аднак прапанаванае меркаванне, што бясплатнасць навучання з'яўляецца асноўнай прычынай невысокай якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, абверглі 36 працэнтаў з апытаных 1130 студэнтаў нашага універсітэта. І толькі 9 працэнтаў катэгарычныя да максімалізму — зразумела, так.

Ці павысіцца каштоўнасць дыплома аб вышэйшай адукацыі пры ўвядзенні платы за навучанне ў ВНУ? «Магчыма, так»,— сведчаць 42 працэнты, пераклікаючыся з 21-працэнтным «наўрад ці». Больш рашучыя падзяліліся на аптымістаў — «так, безумоўна» (19 працэнтаў) і песімістаў — «не» (11 працэнтаў).

Студэнты з розным «стажам» і процілеглымі інтарэсамі салідарныя ў адным: пры ўвядзенні платы за навучанне ў ВНУ не абысціся без кампенсацыі жыццёзабеспячэння і сацыяльнай абароны студэнтаў (незалежна ад сацыяльна-эканамічнай абстаноўкі ў краіне і рэспубліцы). 66 працэнтаў апытаных выказалася за павышэнне стыпендыі, 46 — за ўстанаўленне льготных цэн на прадукты і тавары першай неабходнасці. Пажадалі атрымаць на рукі суму сродкаў, якая затрачваецца на студэнта, 25 працэнтаў, 12 працэнтаў «за» ўвядзенне бясплатнага харчавання і спецадзення.

Жыццё пасля Чарнобыля

ЧАС У ІНШЫМ ВЫМЯРЭННІ

26 красавіка 1986 года. Гэта дзень нашага агульнанацыянальнага траура. З яго мы пачалі жыць у іншым вымярэнні. І калі хто-небудзь верыць у канец свету, то гэтай вясновай ноччу, відаць, не сумняваўся, што ён пачаўся.

Шэрыя страшэнныя хмары плылі ўсё далей і далей, несучы смяротную небяспеку людзям, якія, заўважаючы іх незвычайнасць, нават не падазравалі, што яны ўносяць з сабой іх радасць і шчасце. Праз колькі дзён яны вымушаны будуць развітацца з родным кутам і кінуцца ў пошуках паратунку Бог ведае куды, дзе наўрад ці здабудуць ранейшы дабрабыт і спакой. Бо там, за калючым дротам, у трыццацікіламетровай зоне засталася іх хаціна, а ў ёй — усё нажытае і прыдбанае. Там застаўся іх уклад, іх звычкі, а значыць і само жыццё. Не менш чым на стагоддзе тутэйшая зямля стала мёртвай.

Як ажывіць яе? Як выратаваць ад бяды? Аб гэтым задумваецца сёння ўся сусветная грамадскасць — тыя, каму хоць крышачку ўласціва пачуццё суперажывання і міласэрнасці. Наша рэспубліка атрымлівае апошнім часам істотную матэрыяльную дапамогу і маральную падтрымку. Але маштабы трагедыі настолькі абшырныя, а вынікі — непрадказальныя, што па-ранейшаму не хапае медыцынскага дыягнастычнага абсталявання, медпрэпаратаў, чыстых прадуктаў харчавання. Без дапамогі з-за мяжы нам не абысціся. Хоць са спазненнем, але як добра, што ў нас хапіла розуму і мужнасці шчыра і адкрыта прызнацца ў сваім няшчасці.

Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС у ФРГ быў створаны дабрачынны камітэт «Жыццё пасля Чарнобыля». Варта адзначыць, што на сённяшні дзень толькі па лініі Беларускага экалагічнага Саюза з ФРГ паступіла каля 500 тон грузаў, у тым ліку 32 тысячы харчовых пасылак і каля 100 тон іншых прадуктаў харчавання. Асабліва важнае значэнне мае пастаўка медыцынскага абсталявання і медыкаментаў для бальніц, размешчаных у забруджаных радыёнуклідамі раёнах, а таксама медыцынскіх устаноў Гомеля, Магілёва і Мінска, дзе праходзяць лячэнне жыхары гэтых тэрыторый.

Але часам здаралася так, што не хапала каардынацыі дзеянняў і ККД быў не такім высокім, як хацелася б. З гэтай нагоды актывісты Беларускага экалагічнага Саюза і камітэта «Жыццё пасля Чарнобыля» ФРГ вырашылі сабрацца на сумесны Міжнародны навукова-практычны семінар. А каб размова была па сутнасці, запрасілі на яго прадстаўнікоў урада рэспублікі, вучоных, кіраўніцтва забруджаных раёнаў.

Доўгі час у нашай краіне маштабы чарнобыльскай катастрофы спрабавалі зменшыць, з намі гаварылі мовай паўпраўды. праўда ж ад бяздзеяння і хлусні станавілася яшчэ больш балючай. А людзі спадзяваліся на дапамогу. Толькі як можна дапамагчы хвораму, не ведаючы дакладна дыягназу і гісторыі хваробы? Намаляваць яе ў першую гадзіну работы семінара ўзяўся дырэктар Інстытута радыёбіялогіі АН БССР, прафесар, доктар медыцынскіх навук Я. Ф. Канапля. Радыёэкалагічныя і радыёбіялагічныя вынікі аварыі на Чарнобыльскай АЭС — вось тэма яго выступлення. Грунтуючыся на шматгадовых даследаваннях інстытута, які ён узначальвае, на рэзультатах работы іншых савецкіх і замежных вучоных, а таксама на сваіх уласных, Яўген Фёдаравіч, здаецца, здолеў пераканаць прысутных, што Чарнобыльская катастрофа — агульначалавечая. І ўдзельнічаць у ліквідацыі яе вынікаў — абавязак кожнага цвярозадумаючага чалавека.

Аднак сітуацыя сёння ўскладняецца тым, што мы дакладна не ведаем, колькі было выкінута ў выніку аварыі радыёактыўных рэчываў. Думак існуе шмат, а вось аб'ектыўна зрабіць вывады пакуль не так лёгка. Да таго ж, са многімі з іх мы не ведаем, як змагацца — не існуе механізму вываду іх з арганізму.

— Чарнобыльская трагедыя ўсё больш і больш дае аб сабе знаць,— разважае Я. Ф. Канапля.— Павялічваецца колькасць хворых з анкалагічнымі і сардэчна-сасудзістымі захворваннямі, назіраецца рост выпадкаў гіпертанічнай хваробы і запаленчых працэсаў, зніжэнне супрацьмікробнага імунітэту. Справа ў тым, што праз год пасля аварыі кароткажывучыя ізатопы распаліся, а засталіся доўгажывучыя. Яны і вызначаюць зараз радыяцыйную абстаноўку, якая будзе мяняцца крайне марудна і залежыць ад натуральнага распаду.

Прывяду прыклад. У выніку аварыі, як вядома, у паветра выкінуты плутоній 241. Перыяд паўраспаду — 14 гадоў. Пасля гэтага ён ператвараецца ў амерыцый, які напалову распадаецца толькі за 140 гадоў. Да таго ж ён надзвычай таксічны. Вось і паспрабуй пасля гэтага адказаць на пытанне: калі радыяцыйная абстаноўка ў рэспубліцы стане больш-менш небяспечнай для здароўя людзей. Асабліва тых, хто знаходзіцца ў так званай зоне жорсткага радыяцыйнага кантролю.

УСЁ ДОБРА, ЦУДОЎНАЯ МАРКІЗА?

Другі дзень работы семінара павінен быў пачацца з выступлення намесніка старшыні Савета Міністраў БССР І. А. Кеніка аб праграме ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС. Але мяркуемы прамоўца аказаўся чалавекам вельмі занятым, і замест яго перад прысутнымі выступіў загадчык аддзела Савета Міністраў рэспублікі па праблемах ліквідацыі чарнобыльскай катастрофы Г. М. Панькоў.

Здаецца, не адна я была ў разгубленасці пасля прамовы Георгія Мікалаевіча. Шчыра кажучы, здзівіў яго спакой і ўпэўненасць (ва ўсялякім выпадку, ён імкнуўся ўмацаваць гэта пачуццё ў удзельнікаў семінара) у тым, што з ліквідацыяй вынікаў аварыі ў нас усё ў парадку. Быццам і не было замоўчвання яе маштабаў, прамаруджвання ўрада рэспублікі з адсяленнем людзей з забруджаных тэрыторый, з забеспячэннем тых, хто па той ці іншай прычыне застаўся на наседжаным месцы, чыстымі прадуктамі харчавання, і г. д.

Безумоўна, нельга сцвярджаць, што ўрадам рэспублікі нічога не робіцца ў гэтым напрамку. Як адзначыў Г. М. Панькоў, толькі ў мінулым годзе каля 15 тысяч сем'яў пакінулі забруджаныя раёны і атрымалі дзяржаўнае жыллё. Яшчэ больш за 40 тысяч чалавек выехалі з небяспечнай зоны па свабоднаму адсяленню. Сёлета 25 тысяч дамоў і кватэр, што ўзводзяцца на тэрыторыі рэспублікі, прымуць сваіх спакутаваных гаспадароў з тых месц, дзе ўзровень забруджанасці вышэй за 15 кю/км². Георгіем Мікалаевічам былі прыведзены і іншыя суцяшальныя факты. Атрымліваецца, як у той папулярнай песенцы: усё добра, цудоўная маркіза. Аднак удзельнікі семінара — члены Беларускага экалагічнага Саюза і камітэта «Жыццё пасля Чарнобыля» дазволілі сабе не пагадзіцца з такімі довадамі і выказалі свае сумненні. Відаць, не даспадобы падалося прадстаўніку ўрада пытанне загадчыка аддзела БЭСа А. М. Рухлі. Па лініі Саюза Аляксандр Мікалаевіч займаецца непасрэдна пытаннямі перасялення людзей у чыстыя раёны. Аднак неаднойчы, робячы замеры ўзроўню радыяцыйнага фону, ён пераканаўся, што часта для перасялення пацярпеўшых жыллё будуецца на... забруджанай тэрыторыі. Ён прывёў прыклад такога выкідвання на вецер дзяржаўных грошай з пасёлкам Майскі, што ўзводзіцца ля Чудзян. Ды ці мала такіх новабудоўляў?

«А як можна апраўдаць той факт, што на забруджаных землях да гэтага часу вядуцца сельскагаспадарчыя работы, вырошчваецца і збіраецца ўраджай, які потым трапляе і на нашы з вамі сталы?» — паспрабаваў паставіць пытанне рубам прафесар БДУ А. І. Шадыра. Аднак і яно не надта засмуціла Г. М. Панькова. Ён запэўніў, што нам з вамі няма чаго баяцца, бо ўсе прадукты харчавання

перад тым, як трапіць на паліцы магазінаў, праходзяць двайны і нават трайны радыяцыйны кантроль. Што датычыць сельскагаспадарчай дзейнасці, то Дзяржагапрамам рэспублікі распрацавана сістэма атрымання чыстай прадукцыі. Навукай (і практыкай таксама) даказана, што асобныя культуры (кукуруза, напрыклад) на палях з забруджанасцю каля 40 кю/км² атрымліваюцца чыстыя. А вось злакавыя і шматгадовыя травы наадварот, пры забруджанасці 5 кю/км² могуць быць непрыгодныя для ўжывання. Навуковае абгрунтаванне гэтай канцэпцыі вядома ўсім спецыялістам, якія працуюць у сельскай гаспадарцы.

Цяжка сказаць, ці разлічваў сам Г. М. Панькоў, што яго словы будуць прыняты на веру. У гэта мала верылася нават нам, дылетантам. Не кажучы ўжо пра тых, хто сутыкнуўся з чарнобыльскай трагедыяй, як кажуць, твар у твар, адчуў яе смяротнае ўздзеянне на сабе і сваіх блізкіх.

Узялі пад сумненне замежныя госці звестку аб тым, што дзяржавай штогод выдаткоўваюцца немалыя сродкі на так званае забеспячэнне ўмоў небяспечнага пражывання людзей ў забруджаных радыёнуклідамі раёнах (розныя выплаты і г. д.). Яны спрабавалі суаднесці гэту суму з выдаткамі на перасяленне і прапанавалі падумаць над тым, ці не лепш было б спыніць розныя доследы, а грошы выкарыстоўваць на будаўніцтва жылля ў чыстых раёнах?

ПРОСТАЯ АРЫФМЕТЫКА

Дыскусія працягвалася тры дні. Абмен думкамі ішоў у час работы семінара і за кубкам кавы ў час кароткага пяцімінутнага перапынку, у зале пасяджэнняў і на калідоры... У нейкую хвіліну, шчыра кажучы, падумалася: ці зменіць гэта што-небудзь у выражэнні самай балючай для нашай краіны праблемы? Адказам на мае сумненні будуць невялікія інтэрв'ю з нямецкімі гасцямі і арганізатарамі семінара. Ім я і задала сваё пытанне.

— **Андрэяс ЗАЙФЕРД, кіраўнік камітэта «Жыццё пасля Чарнобыля» ФРГ, супрацоўнік евангелісцкай царквы:**

— Наша паездка ў вашу рэспубліку не абмяжоўвалася толькі ўдзелам у рабоце навукова-практычнага семінара. Мы пабывалі ў пацярпеўшых раёнах, правялі кантрольныя замеры ўзроўню забруджанасці тэрыторыі... Выходзячы з уласных назіранняў, пераканаліся, што Беларусь знаходзіцца ў складанай сітуацыі. З аднаго боку — паглыбляецца эканамічны крызіс, з другога — робяць сваю чорную справу вынікі чарнобыльскай катастрофы. Амаль трохгадовае засакрэчванне звестак аб забруджанасці тэрыторыі рэспублікі радыёнуклідамі, аб стане здароўя людзей, якія атрымалі пэўную дозу абпраменьвання, недахоп чыстых прадуктаў харчавання і медыцынскага абсталявання прывялі да таго, што выкананне праграмы па ліквідацыі вынікаў аварыі затарможваецца, а здароўе насельніцтва, асабліва дзяцей, пагаршаецца.

Сустрэчы на беларускай зямлі дапамаглі нам высветліць, чым займацца ў першую чаргу. Мы атрымалі дакладны пералік таго, што неабходна для лячэння людзей, у прыватнасці, ад Мінскай дзіцячай бальніцы № 3, амбулаторнага цэнтра пасёлка Дружны, Брагінскай і Жыткавіцкай раённых бальніц і іншых медыцынскіх устаноў. З навуковага пункту гледжання надзвычай важны абмен дакладнай інфармацыяй.

Э. ЛЕНГФЕЛЬДЭР, прафесар радыёбіялогіі і медыцыны Інстытута імя Ота Хука (Мюнхен):

— У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС у Беларусі забруджана амаль 70 працэнтаў тэрыторыі. Маюць патрэбу ў медыцынскай дапамозе не толькі людзі, якія аказаліся ў зоне распаўсюджання радыёактыўных ізатопаў, але і так званыя ліквідатары — іх каля 600 тысяч.

Пабываўшы ў пацярпеўшых раёнах, мы пераканаліся, што дзяржаўная праграма па ліквідацыі вынікаў аварыі не заўсёды выконваецца. Напрыклад, у вас ёсць такія дарагія і дэфіцытныя дыягнастычныя апараты, як СІЧ. Але, на жаль, не ўсюды яны працуюць на поўную нагрузку. З дапамогай іх можна вызначыць наяўнасць цэзію ў арганізме чалавека. Такія людзі маюць пільную патрэбу ў аздараўленні ў чыстых раёнах. Мы гатовы прыняць у сябе дзяцей і дарослых.

Дарэчы, трэба разлічваць, што ў бліжэйшыя гады будзе павялічвацца колькасць нядобраякасных пухлін. Нават уся сістэма аховы здароўя краіны не здолее вылечыць мяркуемую колькасць хворых. Тут таксама дарэчы міжнароднае супрацоўніцтва. І не абавязкова імкнуцца накіроўваць хворых на лячэнне за мяжу — на гэтыя сродкі ў Саюзе можна паправіць здароўе значна большай колькасці людзей.

А. М РУХЛЯ, загадчык аддзела сувязей з замежнымі краінамі па аказанню дапамогі ў ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС Беларускага экалагічнага Саюза:

— Падводзячы вынікі семінара, можна сказаць, што прайшоў ён даволі плённа. Вынікам абмеркаваня ўзнятых пытанняў было прыняцце Дэкларацыі. У ёй, у прыватнасці, адзначаецца, што дапамога, якая аказваецца беларускаму народу з боку дабрачынных арганізацый ФРГ, набывае асабліва важнае значэнне і як матэрыяльная падтрымка (ужо зараз пастаўлена ў бальніцы рэспублікі медыцынскае абсталяванне, сотні тысяч аднаразовых шпрыцоў, некалькі тон вітамінаў, перавязачнага матэрыялу), і як маральная. Гэта дапамога будзе працягвацца і надалей. Мы мяркуем прадоўжыць акцыі «Кожнаму дзіцяці на тэрыторыі з забруджанасцю вышэй 15 кю/км² — харчовую пасылку» і па паляпшэнню медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Сур'ёзную дапамогу ў гэтым акажа перападрыхтоўка беларускіх урачоў у ФРГ. Мэта яе — навучыць іх працаваць на сучасным медыцынскім абсталяванні, асваенню новых метадаў прафілактыкі і лячэння людзей, якія атрымалі прамянёвую нагрузку.

Прыемна ўсведамляць, што беларускі народ не застаўся сам-насам са сваёй бядой. Думаю, што ўсім мірам і пераадолець трагедыю будзе лягчэй. Простая арыфметыка.

Падрыхтавала да друку
З. АЛЯШКЕВІЧ.

SOS! SOS! SOS!

ГАРЫМ, БРАТКІ, ГАРЫМ

«БУ» КАНСТАТУЕ. Тая раніца для трыццаці студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна магла стаць апошняй у іх жыцці. Полымя адсекла ўжо ўсе выхады і выратавацца самім было немагчыма. Заставалася адно: спадзяваща на прыезд пажарных.

На гэты момант сітуацыя склалася сапраўды крытычная. Каб вывесці людзей у небяспечнае месца, прыбыўшым на падмогу выратавальнікам давялося надзець кіслародныя ізалюючыя процівагазы і ў іх прабівацца скрозь сцяну агню. Некаторых удалося зняць пры дапамозе пажарнай аўталесвіцы. Праз пятнаццаць хвілін пагроза жыццю студэнтаў была ліквідавана.

Што ж здарылася тым ранкам у інтэрнаце № 5, што па вуліцы Кастрычніцкай? Прычыну трагедыі доўга высвятляць не давялося: у адным з пакояў загарэўся магнітафон, пакінуты студэнтам фізфака на некалькі хвілін без прыгляду. У гэтым выпадку, на шчасце, абышлося без ахвяр, калі не лічыць тое, што датла згарэлі рэчы студэнтаў, якія жылі ў адным пакоі з І. Шульганам.

На жаль, не заўсёды ў час пажару можна выратаваць жыццё людзей. Гарадская статыстыка сведчыць, што наша нядбайнасць штогод прыводзіць больш чым да паўтары тысячы пажараў, у якіх гіне не адзін дзесятак чалавек (па рэспубліцы гэта лічба дасягае амаль пяці соцень). Толькі пакуль гром не грымне, мужык не перахрысціцца.

«БУ» НАГАДВАЕ. Так, пажар лепш папярэдзіць, чым патушыць. Аднак як мала клапоцімся мы аб тым, каб ён не ўзнік. Інспектарам Дзяржпажнагляду з году ў год даводзіцца напамінаць кіруючым работнікам універсітэта аб захаванні супрацьпажарнай бяспекі. Аднак яны паспяшаліся перакласці «лішнюю нагрузку» на плечы каменданта інтэрнатаў. Толькі ці хопіць іх улады, каб адрамантаваць аўтаматычную пажарную сігналізацыю, якая нярэдка падводзіць, забяспечыць інтэрнаты гучнагаворачымі ўстаноўкамі апавяшчэння людзей аб пажары, светлавымі ўказальнікамі эвакуацыйных выхадаў і г. д.?

Ёсць і іншая, на першы погляд, ускосная прычына. Яна ў нашай беднасці. Інтэрнаты заўсёды перанаселены: замест трох-чатырох чалавек у пакоі жыве пяць-шэсць. Электра- і газавых пліт на такую колькасць жыхароў не хапае (звычайна трэць з тых, што маюцца, не працуюць). Вось і даводзіцца студэнтам выкручвацца з дапамогай электраплітак і кіпяцільнікаў. Адсюль — патэнцыяльная пагроза ўзнікнення пажару.

«БУ» ПАПЯРЭДЖВАЕ.

— Можа скласціся ўражанне, што падпальшчыкі ў нас — адны студэнты,— заўважае інспектар пажарнай бяспекі універсітэта М. А. Кундалеў.— Вось яны, маўляў, якія нядбайныя і неасцярожныя. Не спяшайцеся з вывадамі: ёсць і сярод супрацоўнікаў такія.

...Незадоўга да Новага года ў лабараторыі арганічнага сінтэзу НДІ ФХП у пакоі № 315 старшы навуковы супрацоўнік В. П. Межанцаў праводзіў лабараторныя работы з выкарыстаннем кіпячага тытуолу. Усё гэта павінна было праходзіць са спраўнай выцяжной вентыляцыяй, аднак супрацоўнік махнуў рукой на правілы супрацьпажарнай бяспекі. Узнік пажар, які, праўда, удалося патушыць сваімі сіламі.

...Калі раптам раздаліся трывожныя гудкі сігналізацыі, вахцёр без прамаруджвання кінулася высвятляць, гаворачы мовай пратаколу, «аб'ект узгарання». Адразу ж набрала па тэлефоне 01. Прыбыўшыя па сігналу трывогі пажарнікі ўзламалі дзверы пакоя, адкуль клубамі валіў дым, і... выключылі электракіпяцільнік, які дырэктар падрыхтоўчых курсаў пакінуў у шклянцы з вадой, збіраючыся напіцца чаю, а сам пайшоў праводзіць заняткі. Віноўнаму давялося не толькі кампенсаваць матэрыяльны ўрон, нанесены агнём, але і развітацца з займаемай пасадай.

Напэўнай, не мае сэнсу далей прыводзіць факты нашай нядбайнасці. Думаю, вы змаглі пераканацца ў тым, што калі б мы крышачку больш адказна адносіліся да сваіх абавязкаў, нічога падобнага не здаралася б.

«БУ» ЦЫТУЕ. У мінулым годзе рэктар падпісаў загад «Аб стане пажарнай бяспекі і мерах па яе паляпшэнню», у якім выказваецца думка, што, магчыма, скарацілася б у нас колькасць пажараў, калі б кожнае памяшканне (вучэбнае ці вытворчае) належала не ў цэлым універсітэту, а канкрэтнаму падраздзяленню, таму што «абязлічка» ні да чаго добрага не прывядзе. Колькі б загадаў і ўказаў мы ні выдавалі на любым узроўні.

«БУ» ПЕРАСЦЕРАГАЕ. Як, напрыклад, гэты — Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб унясенні дапаўненняў і змен у Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны кодэксы Беларускай ССР і кодэкс Беларускай ССР аб адміністрацыйных правапарушэннях». Дарэчы, пакаранні, прадугледжаныя Указам, даволі жорсткія: за невыкананне пастановы Дзяржпажнагляду — штраф да ста рублёў. Добра было б, каб вінаватыя плацілі яго не з кішэні ўстановы, а са сваёй уласнай. Тады і спрос быў бы лепшы.

З. МІХНЕВІЧ.

САКРЭТ ФІРМЫ

Яны чакаюць званка...

Амерыканскі часопіс «Сайенс» лічыць адной з першачарговых праблем як мінулага, так і будучага года «масавае інтэлектуальнае збіванне» вучоных-эмігрантаў з Савецкага Саюза.

У ЗША налічваецца каля 2 тысяч вучоных-бежанцаў узроўню дактароў навук. Большасць з іх непрацаўладкаваныя. Па меркаванню саміх эмігрантаў, моўны бар'ер — найменшая з усіх цяжкасцей. Яны адчуваюць сябе непаўнацэннымі з-за адсутнасці амерыканскай адукацыі, вопыту работы і сувязей, з-за свайго ўзросту, а болей усяго — з-за таго, што... занадта адукаваныя.

Нярэдкія выпадкі, калі вучоныя, маючы доктарскую ступень, зарабляюць грошы, працуючы таксістам, вартаўніком, выгульваючы сабак...»

«Чалавек, які прыязджае з Савецкага Саюза, як дзіця, — сказаў палітэмігрант Яўген Чудноўскі, фізік з Лехман-коледжа ў Нью-Йорку. — Ён не разумее, што адбываецца. Яго здзіўляе канкурэнцыя, жорсткі ціск на вучонага. Многія вучоныя лічаць несумленным звяртацца адразу ў некалькі арганізацый з просьбай прыняць іх на работу. Больш таго, калі яны атрымліваюць стандартную адпіску з той ці іншай навуковай установы, у якой «прызнаецца іх прафесійная кваліфікацыя», але ўказваецца на адсутнасць вакансій, яны больш не шукаюць работу і «чакаюць званка».

Іосіф Расоўскі, былы начальнік акушэрска-гінекалагічнага аддзела адной з Маскоўскіх клінік, які зрабіў сусветна вядомае адкрыццё па ультра-гукавой дыягностыцы, таксама беспрацоўны.

Уладзімір Сегал быў дэканам факультэта апрацоўкі металаў у Беларускім політэхнічным інстытуце. Ён — аўтар 50 патэнтаў у галіне металургіі. Але тыя 200 прашэнняў аб рабоце, якія ён даслаў у фірмы і навукова-даследчыя цэнтры універсітэтаў, не выклікалі цікаўнасць.

Лёс гэтых людзей, на жаль, тыповы. Такія ж тыповыя іх жахі: яны баяцца адстаць ад апошніх дасягненняў у сваёй галіне навукі. «У нас няма часу што-небудзь напісаць, пачытаць спецыяльную літаратуру», — скардзяцца яны, паколькі вымушаны займацца іншай, часцей — фізічнай работай. Цікава, што многія былыя савецкія вучоныя гатовы працаваць бясплатна, але работадаўцам такія адносіны да работы не падабаюцца.

ЗАБАВЕ — ЧАС

Танцы на сняданне, танцы на абед...

Хутчэй сюды, хутчэй! І вы не былі на першым туры танцавальнага марафону? Агульнауніверсітэцкага? Таго, што ўпершыню? Спачуваем. І прадастаўляем апошнюю магчымасць пазнаёміцца з «кароткім зместам папярэдняй серыі». А потым вас чакае другі тур марафону.

Усё пачалося 24 лютага, у нядзелю...

ПЕРШАЯ ГАДЗІНА. Стартавалі ў 14.27. У паўпустой (больш, чым напалову пустой) зале. Пар — восем, але яны неяк адзінока выглядаюць. А танцуюць як! Мяркуючы па пачатку, сілы берагчы не збіраюцца і багатай сваёй рухавай фантазіі не шкадуюць.

Прыкладна ў 15.00 у зале з'явіўся таталізатар, а разам з ім жадаючыя зрабіць стаўкі. Гэта цяпер, у самым пачатку, і сапраўды азартны крок: пары пакуль падабаюцца амаль што ўсе, парадкавыя лічбы на іх адзенні дробныя, цяжка разгледзець — так што хапае ваганняў.

Сярод гледачоў - адзінак танцуюць, зразумела, адзінкі. А пад нумарам 1 сярод удзельнікаў — **Вольга УЛЕВІЧ і Віталь РАХЛЕНКА.**

ДРУГАЯ ГАДЗІНА. Пачалі ў 15.27. На перапынак пары адыходзілі неяк неахвотна, быццам не стаміліся яшчэ. Адпачывалі 10 хвілін, і нічога за гэты час, здаецца, не змянілася. Толькі таталізатар заманіў яшчэ больш ахвотнікаў. Калі ў танцораў з'явіліся першыя прыкметы стомы, таталізатар прыняў самыя буйныя стаўкі — дзве па 30 рублёў. Нават «амонаўцы» не ўстрымаліся ад азарту і «паставілі» на абраныя пары.

Другі нумар па жэрабю дастаўся **Алене КРЫЛОВІЧ і Віталю ГАЎРУСЕВУ.**

ТРЭЦЯЯ ГАДЗІНА. На другі перапынак удзельнікі рушылі больш жвава, ужо пачалі пераапранацца. Вярнуліся яны да працы сваёй цяжкай у 16.27. На пляцоўцы з'явіліся першыя рушнікі і насоўкі для выцірання твараў.

Гледачы ўжо паспелі зрабіць свой выбар, у тым ліку ў бок страхавання слабых пар — гэту магчымасць таксама дае таталізатар: уклаўшы грошы, прадказваеш паражэнне. Гледачоў стала яшчэ менш...

Пад № 3 танцуюць **Іна КРАЎЧАНКА і Вячаслаў ЯФІМАЎ.**

ЧАЦВЁРТАЯ ГАДЗІНА. Трэба было пачаць у 17.27, але атрымалася крыху пазней. Марафон ледзь не згубіў дзве пары, якія спазніліся. Нарэшце арганізатары дазволілі ім вярнуцца на пляцоўку.

У хуткім тэмпе, зноў у хуткім! Пасля «Цыганачкі» — «Весялуха». І без халтуры! Вось і ўзнагарода — павольная мелодыя. А потым зноў — у віхуры рухаў. Зноў павольна. Гэта відавочна падарыла марафонцам другое дыханне (ці дваццатае?). Але пачалі стамляцца гледачы. Нават «бакавыя суддзі», што сочаць за выкананнем умоў конкурсу, прыселі з абыякавымі позіркамі.

«Чацвёрка» нашыта на адзенне **Наталлі ПЕТРЫКАВАЙ і Андрэя МАТВЯЙКОВА.**

ПЯТАЯ ГАДЗІНА. 18.27 — яе пачатак. Толькі цяпер, калі падышоў вечар, гледачоў заўважна прыбавілася, і конкурс стаў больш падобны на дыскатэку. Яркага асвятлення больш няма, толькі некалькі ліхтароў пакінута. Удзельнікі не супраць — той-сёй з іх ужо не абыходзіцца без нашатыра. Іх імправізацыі вось-вось павінны знікнуць канчаткова... Не, дзе там! Зноў такая вынаходлівасць у рухах гэтых стомленых людзей.

Прадстаўнікі АМАПу сталі часцей з'яўляцца ў зале — каб пасачыць... за марафонцамі, вельмі гэта прываблівае відовішча.

Пятыя па жэрабю — **Вольга АЗЕВА і Віктар КУДРАЎСКІ.**

ШОСТАЯ ГАДЗІНА. 19.27. На таталізатар ужо даўно забыліся. Усё часцей выказваецца меркаванне, што ўсе пары вытрымаюць марафонскую дыстанцыю да канца.

У зале сапраўдная дыскатэка — масавая, бадзёрая, вясёлая. Гэта павінна быць падтрымкай для тых, хто на пляцоўцы, калі не ўлічваць, што ў паветры ўсё больш вуглякіслага газу. І яшчэ нейкая намагнічанасць, якая асабліва адчуваецца пры набліжэнні да марафонцаў.

Святлана АБРАЗКОВА і Сяргей МАРЦІНКЕВІЧ — «шасцёркі» (толькі ў сэнсе іх парадкавага нумару на конкурсе).

СЁМАЯ ГАДЗІНА. 20.57 — усё той жа нядзелі, 24 лютага, і ў той жа зале, здаецца...

Вы бачылі калі-небудзь дзяўчыну, якая танцуе джаз пасля амаль няспынных рухаў на працягу шасці гадзін? Тут такіх адразу некалькі. І яны — уявіце сабе — зачароўваюць. Мокрыя валасы, нетутэйшы выраз твараў, паўаўтаматычнасць рухаў... Прыгожа і прывабна!

Шматлюдная дыскатэка ператвараецца ў суцэльнага гледача, калі пачынае гучаць рок-н-рол ці джазавая кампазіцыя. Пашчасціла ж сёння некаму на відовішча!

Пара № 7 адсутнічае. Не, не выбыла — з самага пачатку.

ВОСЬМАЯ ГАДЗІНА!!! Перапынак скончыўся ў 21.27. А большасць марафонцаў сядзяць сабе на сцэне і ваду п'юць. Толькі голас вядучага з пагражальнай інтанацыяй здолеў падняць іх. Марафон працягваецца! Колькі разоў яны ўжо памянялі мокрае адзенне на сухое? Ці дадумаўся хто з іх узважыцца да пачатку спаборніцтваў? Цікавая павінна атрымацца розніца паміж той лічбай і тым, што пакажуць вагі пасля заканчэння марафону.

Восьмыя на ім — **Святлана ГРУДЗІНА і Павел ГАЛКОЎСКІ.**

ДЗЕВЯТАЯ... Не было яе. У 22.17 прагучалі апошнія такты «Ламбады», і пары развіталіся нарэшце з пляцоўкай, якая прыняла ад іх ног незлічона ўдараў.

Апошняя, дзевятая пара — **Іна КРАКОТНІК і Алег СЕВЯРЫНЧЫК.** Яны заваявалі (ці забяспечылі?) сабе найбольшую колькасць балельшчыкаў.

Наступная сустрэча з «цудоўнай дзевяткай» у складзе весьмі пар адбудзецца 3 сакавіка, у 16.00. Для тых, хто не трапіць на яе, застанецца яшчэ трэці і чацвёрты тур першага агульнауніверсітэцкага танцавальнага марафону з многаабяцаючай назвай «Радасць».

В. БЯГУН.

ДЛЯ ЦЯБЕ

ГРОСБУХ

Грошы любяць падлік

«Таня + Андрэй = каханне» — такім было першае матэматычнае дзеянне на іх сумесным шляху. Цяпер, пасля вяселля і года сямейнага жыцця, ім даводзіцца займацца больш складанай арыфметыкай. Здаецца, атрымліваецца. Больш таго, маладыя супругі лічаць, што іх вопыт у гэтай справе можа прынесці карысць многім «калегам» з нованароджаных сем'яў.

Таня і Андрэй — студэнты. Жывуць на кватэры, здымаюць адзін пакой за 80 рублёў у месяц. Гэта самы значны з перыядычных выдаткаў іх сямейнага бюджэту, які складаюць даходы з дзвюх асноўных крыніц: сумарнай стыпендыі супругаў — што крыху больш чым 100 рублёў у месяц, і дапамогі бацькоў, адных і другіх — гэта яшчэ 200 рублёў штомесячна.

Як звычайна, у сямейным бюджэце бываюць і выпадковыя даходы. Напрыклад, прэмія, якую атрымаў у мінулым месяцы ад дэканата Андрэй. Ці тыя 25 рублёў, што знайшла аднойчы ў метро Таццяна.

Для ўсіх даходаў — як перыядычных, так і неперыядычных — ёсць асобнае месца ў сямейнай касавай кнізе, якую Таня і Андрэй вядуць з самага пачатку сумеснага жыцця і вельмі старанна.

Любыя выдаткі, і пастаянныя, і пазапланаваыя, таксама адлюстроўваюцца ў гэтай кнізе. А яшчэ ў ёй ёсць раздзел «Эканомія», дзякуючы якому муж і жонка ў любы момант могуць ацаніць магчымасці «вольнай сумы», якую яны маюць для буйных пакупак (штодзённыя Таня і Андрэй робяць за кішэнныя грошы, якія пастаянна носяць з сабою).

Яны адразу вырашылі, што ўсе набыткі ў магазінах, акрамя самых дробных, будуць рабіць разам. Але ўмовы паўсядзённага жыцця прымусілі іх перагледзець гэтыя намеры: не заўсёды і ў аднаго, і ў другога хапае часу і сіл на гандлёвыя пагоўпы. І ўсё ж Андрэй не любіць, калі жонка бегае па магазінах без яго: яна заўсёды імкнецца трапіць у «хвост» літаральна кожнай чаргі, якую бачыць. А ў адказ на заўвагі мужа не стамляецца паўтараць, што ім патрэбна УСЁ! У такіх спрэчках Андрэй выкарыстоўвае надзейны аргумент на сваю карысць — сямейную касавую кнігу. З яе дапамогай ён, як больш рацыянальны член сям'і, тлумачыць жонцы, што пакупкі бываюць абавязковыя, пажаданыя і тыя, без якіх яны, уладальнікі сціплага бюджэту, могуць пакуль абысціся. У кнігу занесены ўсе вясельныя падарункі, якія сваякі і госці зрабілі маладым, а таксама тое, што яны паспелі самі і з дапамогай бацькоў набыць на працягу года. На вопратцы касавай кнігі Андрэй напісаў буйнымі літарамі: «Мы не настолькі багатыя, каб купляць танныя рэчы» — і спрабуе зрабіць гэты выраз дэвізам жыцця. Не забываюцца яны з Таццянай і на апошнія старонкі сваёй каштоўнай кнігі, дзе маюць спіс усяго неабход-

нага для іх маладой сям'і, з улікам ужо набытай маёмасці і тэрміновасці пакупак, якія плануюцца.

І Таня, і Андрэй прызнаюцца паасобку, калі спытацца, што кожны з іх мае яшчэ і ўласную касавую кнігу. У ёй запісаны толькі адзін від грошай — тыя, што адкладваюць яны на падарункі адзін аднаму. Што да падарункаў сваякам і сябрам, дык пра гэта не забыта ў агульнасямейным «гросбуху».

Фінансавыя сакрэты раскрывала Вераніка БЯГУН.

НА КІЛІМ!

КАЛЭНЕЦІКС

Працягваем друкаваць для вас комплекс гімнастыкі прыгожых і вядомых жанчын (Пачатак у №№ 1, 4 за гэты год). У мінулы раз мы спыніліся на практыкаваннях для ног.

1. Рукі зноў ляжаць на спінцы крэсла на шырыні плячэй. Зноў максімальна падніміся на пальцах, пяткі трымай разам, а калені развернутымі ў бакі. Апусціся на 6 см, не больш, але не падай на пяткі. Трымайся прама. Вярніся на высокую пазіцыю і паўтары 10 разоў.

2. Левая нага, прамая, ляжыць пяткай на спінцы крэсла. Цела развернута ўбок. Падніміся рукі ўверх, пацягніся так, каб адчуць мышцы жывата. Пратрымайся так хвіліну, потым з рукамі, выцягнутымі над галавой, нахіліся ў напрамку ступні. Разцягні спіну. Памятай: не трэба класці ступню вельмі высока, бо так цяжка ўтрымаць раўнавагу. Будзь асцярожная, не перанапружвай калені і не засмучайся, калі не здолееш дастаць ступні рукамі. Адпачні, паклаўшы рукі і ногі так, як зручна табе. Свабодна рухай тулава ў напрамку калена і пачынай усё спачатку. Выканай гэта 50 разоў. Калі адчуваеш вельмі моцнае напружанне мышцаў, не рухайся, але ў гэтым становішчы (выцягнутым) далічы да 50.

Калі не здолееш выпраміць і добра напрагчы паднятую нагу, не жмі сілай сагнутага калена. У такой пазіцыі можаш выканаць тое ж самае практыкаванне, а праз некаторы час нага без тваёй дапамогі сама распраміцца.

3. Паднімі правую нагу, сагнутую ў калене. Сярэдзіны ступняў апіраюцца на крэсла. Трымайся за крэсла абедзвюмя рукамі. Выпрамі правую нагу, як зможаш, але не цягні крэсла рукамі, яно служыць толькі для падтрымкі раўнавагі. Пратрымайся з выпрамленай нагой, пакуль лічыш да 50. Паўтары тое ж самае з левай нагой. Не блакіруй калені і не прымушай паднятую нагу выпрамляцца. З часам, калі ногі твае будуць расцягнуты і натрэніраваны, ты зробіш усё з лёгкасцю.

Практыкаванні, якія трэба выконваць далей, прыводзяць у рух адначасова некалькі груп мышцаў, таму пасля іх адчуваецца добры настрой і самаадчуванне.

1. Стань перад крэслам, для зручнасці на падушку. Адхіліся назад з прамымі плячыма. Трэба напрагчы спіну і перасунуць таз наперад. Плечы нахілі ўперад, каб акругліць спіну і напрагчы пазваночнік. Рукі выпрамленыя. Не адрываючы ступні ад падлогі, свабодна паднімі левае калена ўверх на вышыню, на якую здолееш, потым рухай яго ўбок, прычым не адрываючы ступні ад падлогі. Так трымайся. І толькі пасля хвіліны паднімі ступню на 6—7 см над падлогай. Ягадзіцы трымай напружанымі, таз, як звычайна, упередзе. Адхілі калена на 2 см назад і вяртайся ў першапачатковае становішча. Выканай гэта практыкаванне 100 разоў з кожнага боку.

МУЖЧЫНЫ, ПАСПРАБУЙЦЕ!

Раз, два — і дошка

Калі вы зробіце ўсё як трэба, дошка атрымаецца нават больш зручная, чым тыя, што прадаюцца ў магазінах. Перш за ўсё яна будзе даўжэйшая — так, каб яе хапіла для буйных рэчаў. Апорныя элементы, якія звычайна робяцца рамантычнымі, у даным варыянце выконваюцца са шчыткоў, што добра бачна на малюнку.

Дошка збіраецца з наступных элементаў: гарызантальны шчыток для прасавання і тры апорныя шчыткі — адзін доўгі (1100 мм) нахілены і два кароткія нахіленыя. Шчыткі замацоўваюцца паміж сабою раяльнымі петлямі, што дазваляе складваць дошку, як гэта паказана на малюнку В. Напрамак руху ўказаны стрэлкамі на малюнку А, дзе даецца выгляд дошкі збоку. Тут жа прыводзяцца асноўныя памеры, неабходныя для яе вырабу. Шырыня дошкі 300—350 мм, такую ж шырыню маюць і апорныя шчыткі.

Спачатку трэба выпілаваць шчыткі патрэбных памераў. Гарызантальны шчыток з аднаго боку закругліць, да ніжняй яго паверхні ў месцы, які ўказаны на чарцяжы, прыклеіць два брускі (гл. вузел 1). Іх даўжыня такая ж, як шырыня дошкі, а сячэнне 25×60 мм. Да доўгага нахіленага шчытка ў адзначаных на чарцяжы месцах прымацоўваюць тры раяльныя пятлі. Для мацавання выкарыстоўваюць шрубы, даўжыня якіх павінна быць на 22 мм меншай за таўшчыню шчытка, а дыяметр — 4 мм. Да петляў прымацоўваюць гарызантальны шчыток (гл. вузел 1) і два кароткія нахіленыя (гл. вузлы 2 і 3).

Самая зручная вышыня дошкі — 740—760 мм. Яна залежыць ад росчыну доўгага і кароткага накладных шчыткоў. Каб патрэбная вышыня не «распаўзалася», у ніжняй іх частцы замацоўваецца надзейны шнур (мал. А і Б). Можна зрабіць і інакш: прымацаваць пятлёй да кароткага нахіленага шчытка распорку, якая верхнім канцом упіралася б у гарызантальны шчыток знізу (на малюнку гэты прыём не паказаны).



Шчыткі лепш вырабляць са сталярнай ці драўлянастружкавай пліты таўшчынёй 16—19 мм. Каб канты не крышыліся, іх трэба зашпаляваць. Паверхні афарбоўваюць нітраэмаллю. Шчыток, на якім прасуюць, абіваюць тканінай.

ЖАНЧЫНЫ ЛЮБЯЦЬ...

Які ж без гальштука мужчына?

Ніякая мода не ў стане перамагчы гальштук.

Сёння мадэльерамі дапускаецца ўжо і спалучэнне гальштука з мяккай, свабоднай курткай. Камфортнае, амаль спартыўнае адзенне становіцца з дапамогай гальштука больш прадстаўніча дзелавым.

На жаль, многія мужчыны не разумеюць, якімі прывабнымі робіць іх гэта невялікая дэталь у адзенні — гальштук, асабліва, калі да яго дадаць хустачку з той жа тканіны, каб яна выглядвала з нагруднай кішэні. Можа, праблема не ў тым, што яны не разумеюць, а ў тым, што проста не ўмеюць завязваць гальштук? У такім разе паспрабуем дапамагчы ўсім прыхільнікам элегантнасці. Калі ласка — перад вамі два самыя распаўсюджаныя спосабы з сапраўднай навукі завязвання гальштука.

ДЛЯ ПРАКТЫЧНАЙ ГАСПАДЫНІ!

НЕ ВЫКІДВАЙЦЕ НІЧОГА!

Уменне эканоміць становіцца ўсё больш актуальным для нас. Авалодаць гэтым мастацтвам не так складана — калі пастарацца, паступова з'явіцца звычка берагчы кожную рэч, і нават самыя старыя з іх будуць здавацца карыснымі, бо вы зробіце іх такімі.

Пачніце з самага простага. Пэўна, вы заўважылі, што падкоўдранікі хутчэй зношваюцца па верхняму краю, а прасціны — пасярэдзіне. І тыя, і другія не спяшайцеся выкідваць і пускаць на анучы. Рэчы яшчэ паслужаць вам, калі вы не пашкадуеце крыху часу і намаганняў.

Адрэжце знойшаны край падкоўдраніка і надстаўце яго бакавымі кускамі прасціны.

З трох падкоўдранікаў, якія ўжо немагчыма ўжываць, можна пашыць два паўнацэнныя.

Зношаную прасціну разрэжце напалам уздоўж і сшыйце так, каб больш моцныя яе кускі апынуліся пасярэдзіне.

Па такому ж прынцыпу можна аднавіць стары рушнік: выразаць з яго рваныя і пацёртыя месцы, сшыць цэлыя кускі, а яшчэ лепш скамбінаваць два рушнікі. З кускоў рушніка для посуду можна зрабіць сурвэткі.

У начных баваўняных кашулях хутка зношваецца верхняя частка. Адрэжце яе — добраяануча атрымаецца. А з таго, што засталося, калі гэта моцная яшчэ ніжняя частка, можна пашыць навалачку.

Мужчынскія кашулі светлага колеру з ільняных, паркалёвых і штапельных тканін лёгка перашыць на фартух ці на тую ж навалачку.

Цяпер успомніце, калі ласка, пра тую частку вашага гардэроба, якая даўным-даўно ляжыць дзесьці на дальніх паліцах і антрэсолях. Гэтыя рэчы чакаюць абнаўлення, пераробкі, не спяшайцеся лічыць іх наогул непатрэбнымі. Любы выраб можа цалкам памяняць сваю функцыю, калі паспрабаваць яго перарабіць.

Паспрабуйце паглядзець на сваё старое, забытае адзенне і абутак свежым позіркам. Не бойцеся самых смелых ідэй, якія напаткаюць вас. Выходзьце не з былога фасону і аддзелачных элемнетаў, а з фактуры тканіны, з якой выраблена даная рэч. Шырокія магчымасці дае камбінаванне матэрыялаў — тэкстылю, вязанага палатна, замшы, скуры.

Пра скуру размова асобная. Цяжка парадаваць з ёй яшчэ які-небудзь матэрыял па эластычнасці, камфортнасці, даўгавечнасці. Скура «дыхае»: прапускае паветра і вільгаць, валодае цудоўнымі ахоўнымі якасцямі. Высокія эстэтычныя яе вартасці робяць скуру незамяняльнай для аддзелкі, дэкарыравання рэчаў.

Вы, зразумела, заўважылі, што скураныя вырабы зношваюцца нераўнамерна: у месцах згібаў знікае фарба, скура трэскаецца, але новыя дэталі яе пры гэтым застаюцца практычна новымі. Таму нельга выкідваць скураныя сумкі і партфелі, у якіх сапсаваліся ручкі, абадраліся краі ці зламаўся замок, пальчаткі з парванымі пальцамі ці без пары і т. п. Цэлае багацце — старое скураное паліто, куртка, пінжак ці спадніца з сур'ёзнымі дэфектамі, якія выключаюць магчымасць насіць рэч у першапачатковым выглядзе.

Каштоўная сыравіна — абутак. Нават у самых зношаных жаночых ботах звычайна захоўваюцца цэлымі халявы. Іх абавязкова трэба выкарыстаць!

Дапусцім, вы шыеце новы касцюм ці сукенку. Сэканомленая дзякуючы старым рэчам скура дапаможа вам дадаць да новага гардэробу цікавыя дэталі: з яе можна зрабіць пояс, аплікацыю...

Перад тым, як пачаць нешта выраблять са скуры, яе трэба «амаладзіць». Спачатку ачысціце скуру мокрай анучай. Цяпер трэба выбраць самы просты і зручны спосаб раз'яднання дэталяў. Калі скура вельмі зношаная, можна выразаць нажом добрыя плацыны з яе побач са швамі. Пры гэтым па краю дэталі трэба пакідаць палоску скуры з дэфектамі шырынёй да 1 см — тут потым будуць закалочаны цвікі для расцяжкі.

«Маланка» з ботаў яшчэ спатрэбіцца вам, акуратна выпарыце яе, памыйце ў мыльным растворы і прасушыце. Калі боты мелі падкладку з футры, яе таксама трэба выпараць.

Калі ў вас атрымаецца проста кусок скуры, памыйце яго з добрага боку ў цёплай вадзе з мылам. Затым скурпулёзна змыйце пену чыстай вадой. Сачыце за тэмпературай вады: ад вельмі гарачай скура «дубее», а халодная не размякчае яе. Цяпер крыху адцісніце скуру рукамі і расцягніце на дошцы добрым бокам уверх.

Дэталі нацягваем спачатку ў падоўжным, а потым у папярочным напрамку. Каб зафіксаваць атрыманыя памеры куска, прыбіваем скуру цвікамі да дошкі праз кожныя 2—3 см (у залежнасці ад таўшчыні скуры). У працэсе расцяжкі цвікі давядзецца некалькі разоў перабіваць, каб не было перакосу дэталі.

Скура сохне паўгадзіны. Потым яе трэба тлушчаваць: на ватны тампон нанесці звычайны крэм для скуры і старанна яго ўцерці ва ўсю паверхню, затым сухой губкай паліраваць яе да з'яўлення бляску. Светлую скуру лепш змягчаць не крэмам, а малаком.

Прыкладна праз дзень скура прасохне, яна павінна атрымацца у вас гнуткай, чыстай, бліскучай, як новая! Калі вы не будзеце выкарыстоўваць яе адразу, складзіце дэталі адна на другую добрымі бакамі ўверх, завярніце ў поліэтыленавы пакет, каб не сохлі. Прыдзецца перыядычна перакладаць і праветрываць скуру. Захоўваць ў прахладным цёмным месцы.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

28 лютага

Зак. 2056.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.